*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
16
ЛЮТАГА
№ 5(1598)

## Тэлетайп

### ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

навуковых даследаванняў у бягучым годзе, неабходнасць пашырэння і паглыблення даследчыцкай дзейнасці, больш шырокае заахвочванне ў ёй студэнтаў — гэтыя і многія іншыя пытанні былі ўзняты на пасяджэнні вучонага савета універсітэта. На ім выніках навукова-даследчай работы БДУ ў 1988 годзе прааналізаваў прарэктар па навуковай рабоце, прафесар С. С. Шушкевіч.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### «НАСУСТРАЧ ВЫБАРАМ»

— так называецца выстаўка, арганізаваная аддзелам масавай работы бібліятэкі. На ёй — самыя новыя выданні аб выбарах, разнастайная рэгламентуючая літаратура. Пазнаёміцца з экспазіцыяй выстаўкі вы зможаце, калі наведаеце універсітэцкую бібліятэку (галоўны корпус, 2-гі паверх).

З. ВАЛНІСТЫ.

### КАМАНДА САМБІСТАЎ

нашага універсітэта ўдзельнічала ў першынстве ВНУ рэспублікі па гэтаму віду спорту. Але іх чакала няўдача: спартсмены здолелі падняцца толькі на шостае месца. Прызёры першынства — зборныя Інстытута фізічнай культуры, Інстытута народнай гаспадаркі і радыётэхнічнага інстытута, якія занялі адпаведна першае, другое і трэцяе месцы.

Ч. ВІКТАРАЎ.

### У РАМКАХ ПРАГРАМЫ

круглагадовай Спартакіяды супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта «Здароўе» прайшлі спаборніцтвы па баскетболу і валейболу. Пераможцамі сталі: валейбол — першае месца — ФПМ, другое — фізфак, трэцяе — НДІ ядзерных праблем (мужчыны); факультэт радыёфізікі і электронікі, механіка-матэматычны, ФПМ (жанчыны) — адпаведна на першым, другім і трэцім месцах.

У спаборніцтвах па баскетболу жанчыны не ўдзельнічалі, а сярод мужчынскіх каманд месцы размеркаваліся так: I — кафедры грамадскіх навук, II — механіка-матэматычны факультэт, III — факультэт радыёфізікі і электронікі.

З. МІХНЕВІЧ.



ВЫ БАЧЫЦЕ ўсмешку на твары. Нават у самыя крытычныя моманты яна не знікае. Наташа Архіпенка — студэнтка ФПМ, упэўнена, што з усмешкай жыць лягчэй. Яна дапамагае ў рабоце, прыцягвае людзей, прымушае іх адказваць тым жа. Грамадскае даручэнне Наташы — намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта па арганізацыйнай рабоце. І кожны дзень абавязкова даводзіцца мець справу з людзьмі. Часам патрэбна вырашаць пытанні даволі непрыемныя: вось тут і дапамагае дзяўчыне шчырая ўсмешка.

Фота С. ГРЫЦА.

## Сустракаюць па адзенню

*Першыя майкі з сімволікай універсітэта разышліся ў момант яшчэ на мінулым тыдні. Не крыўдуйцеся тыя, каму не дасталося. Наш фотакарэспандэнт таксама не паспеў. Таму абыходзімся без рэкламных фотаздымкаў.*

Белы колер майкі ўдала адцяняе малюнак, на якім па творчай задумцы мастака Жодзінскай швейнай фабрыкі Леаніда Шаткова адлюстраваны будынак галоўнага корпуса з лаўровымі галінкамі па баках і надпісам «Беларускі універсітэт» зверху і знізу на беларускай і англійскай мовах.

— Ці не скапіравана ідэя з сімволікі на футболцы МДУ імя М. В. Ламаносава?

— Не,— запэўнівае намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэрнацыянальнаму выхаванню Юрый Чабатароў.— Маскоўскі універсітэт не першаадкрывальнік у гэтай справе. У нас і раней была сімволіка. Цяпер састарэла (ды і выглядала крыху аляпавата) — спатрэбілася новая.

— Яна спадабалася?

— Мяркуючы па хуткасці, з якой разышлася першая партыя...

— А калі з'явіцца, нарэшце, такая футболка, якую можна было б насіць кожны дзень, у якую не сорамна было б апрануць і каманду КВЗ?

— Пазней. Трэба яшчэ прадумаць эскіз.

Пакуль жа запрашаем набыць майкі на трэцім паверсе галоўнага корпуса ў пакоі № 308. Кошт адной — 4 руб. 50 кап. Другая партыя паступае адразу пасля канікулаў. Спяшайцеся!

Д. МАЛІНОЎСКІ.

ДЛЯ СЛУЖБОВАГА КАРЫСТАННЯ

## Унікальнасць і дакладнасць

СТВАРЭННЕ новых прылад, прыстасаванняў, лекавых прэпаратаў — вось далёка не поўны пералік задач, якаснае рашэнне якіх ва ўмовах навукова-тэхнічнага прагрэсу немагчыма без выкарыстання патэнтнай інфармацыі.

Патэнтная інфармацыя — гэта інфармацыя аб адкрыццях, прамысловых узорах і таварных знаках. Яна выкарыстоўваецца на ўсіх этапах стварэння новых тэхнічных рашэнняў.

Вывучэнне патэнтнай інфармацыі актывізуе творчае мысленне і стымулюе пошук новых, больш прагрэсіўных рашэнняў, а яе прымяненне — шлях да вырашэння навуковых, вытворчых і камерцыйных задач. У параўнанні з іншымі відамі НТІ, яна валодае істотнымі перавагамі: унікальнасцю, дакладнасцю, універсальнасцю, упарадкаванасцю, мае дакладную структуру і г. д.

З навінкамі патэнтнай інфармацыі, а таксама з дзеючай выстаўкай навукова-тэхнічнай літаратуры (экспрэс-інфармацыя, замежныя выданні, агляды, указальнікі і летапісы) вы можаце пазнаёміцца па адрасу: вул. Бабруйская, 7, п. 67, а таксама ў бібліятэцы БелНДІ навукова-тэхнічнай інфармацыі, праспект Машэрава, 7, п. 502.

Л. НАУМОВІЧ,
в. а. загадчыка аддзела
патэнтнай работы.

## У наступным нумары чытайце:

Цяжка знайсці чалавека, які не любіць задаваць пытанні. Імкненне пазнаць свет, разабрацца ў жыццёвых з'явах узнікае ў нас ледзь не з самага нараджэння. Хочацца верыць, што чытачы нашай газеты таксама не выключэнне з ліку цікаўных людзей. Таму прапануем... згуляць у пінг-понг. Першая сустрэча адбудзецца ў наступным нумары. Складанае пытанне аб рэгіянальным гасразліку парыруе выкладчык кафедры паліт-эканоміі А. Э. Васільева. Жадаючых прыняць удзел у «чэмпіянаце» просім дасылаць свае пытанні. Аўтар самага цікавага і надзённага з іх атрымае тытул чэмпіёна «Беларускага універсітэта» па пінг-понгу і адмысловы падарунак.

## Страціўшы — заплачам

Як мы адносімся сёння да гісторыі, такой пашаны можам чакаць праз стагоддзі і да сябе. На гуманітарных факультэтах нашага універсітэта чытаецца курс беларускай старажытнай літаратуры. І, як лічыцца, студэнты маюць магчымасць больш-менш пазнаёміцца з ёй. А паспрабуйце перагледзець кніжную спадчыну ў нашай рэспубліцы: здаецца, што літаратуры і наогул не было.

У 1959 (!) годзе Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы АН БССР была выдадзена хрэстаматыя па гэтай дысцыпліне. Толькі яе ды «Песню пра зубра» побач з «Тарасам на Парнасе», «Энеідай навыварат» і знойдзеш у бібліятэках. Іншыя кнігі проста не выдаюцца. Я не згодны, каб беларусу не цікава было б прачытаць у Слуцкім летапісу пра паходы князёў Кейстута і Вітаўта. А поўны збор Рускіх летапісаў можна знайсці толькі ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна.

Страціць магчымасць пазнаёміцца з літаратурай. Ці не азначае гэта перарваць нітку пазнання чалавекам самога сябе?

Няшмат твораў старажытных аўтараў жывуць і цяпер. Яны для нас — вялікая рэдкасць. Бо выдавецтвы, узяць хаця б «Універсітэцкае», не спяшаюцца захаваць для нашчадкаў тое, што ёсць.

Аляксандр ШАРПІЛА,
студэнт журфака.

## Адзяленне сувязі

## Быў дзе? У Волагдзе

Калі вы адчуваеце, што на канікулах шмат часу страцілі дарэмна, звярніцеся за вопытам да тых вашых таварышаў, якія вырашылі правесці іх актыўна.

На час сёлетніх зімовых канікул універсітэт атрымаў, як ніколі, многа розных пуцёвак. Напрыклад, 58 нашых студэнтаў паехалі па маршруту «Мінск — Вінніца — Кішынёў — Адэса», 85 чалавек убачылі рускія гарады з цікавай гісторыяй: Яраслаўль, Кастраму, Волагду, Вялікі Усцюг і Горкі. А больш за ўсё — 184 пуцёўкі — распаўсюджана ва універсітэце для тых, хто пажадаў сустрэцца з Петразаводскам і Ленінградам.

Мабыць, вы чыталі ў «Вячорцы» запрашэнні ў падобныя паездкі ад імя аб'яднання «Мінсктурыст». Але ж тыя, хто набыў пуцёўкі ва універсітэце, аплацілі толькі 50 працэнтаў іх кошту — выгада відавочная.

Адчулі ўвагу да сябе і некаторыя з аматараў больш спакойнага адпачынку, бо універсітэт атрымаў месцы ў двух дамах адпачынку: 20 месц у «Нарачы» і 35 — у «Пухавічах» (усе пуцёўкі 30-працэнтныя). Акрамя таго, зараз вырашаецца пытанне аб паездцы нашых студэнтаў на турбазу «Світанак» у Сочы.

Што ж, надышоў час вяртання нашых калег і сяброў. Ад іх і даведаемся аб уражаннях і новых знаёмствах.

Ніна ТУРОМША,
намеснік старшыні
студэнцкага прафкома
па арганізацыйна-
масавай рабоце.

## У тэатр... за бутэрбродам

ШТОДЗЕНЬ, акрамя аўторкаў, выстройвалася гэтая чарга ля выставачнага комплексу. Ніхто не здзіўляўся, бо тэматыка «Інфарматыка ў жыцці ЗША» не магла не захапіць моладзь і людзей старэйшага ўзросту. Наладжванню трывалых кантактаў садзейнічалі як добрае веданне рускай мовы, так і зацікаўленасць арганізатараў выстаўкі ў ацэнцы, якую наведвальнікі выстаўлялі на паперы ці на экране камп'ютэра.

Безумоўна, большасць людзей прыйшла сюды для азнаямлення з магчамасцямі камп'ютэрызацыі ў сферы прамысловай вытворчасці, медыцыны, асветы, быту. Побач са мной аказаліся хлопцы, якія былі тут, мяркуючы па іх выказваннях, не першы раз.

— Цікава? — дапытвалася я.

— А ты думаеш? — пераконваў бліжэйшы сусед. У мяне дома ўжо шаснаццаць пакетаў ляжыць.

У сямнаццаты раз ён стаў у чаргу зусім не дзеля таго, каб задаволіць сваю дапытлівасць. Дармавы значок, ілюстраваны часопіс, поліэтыленавы пакет... Хіба на гэта разменьваюць сапраўдную зацікаўленасць?

— Сярод моладзі сёння адны прагматыкі,— канстатуем мы ўсё часцей і часцей. А што, калі і ў тэатр мы ў хуткім часе будзем хадзіць таму, што ў буфеце можна набыць дэфіцытныя цукеркі ці з'есці бутэрброд з чорнай ікрой?

Вось чаму пасля выстаўкі ў мяне сапсаваўся настрой...

Святлана СІРОТКА,
студэнтка факультэта
журналістыкі.

*Магчыма, маюць рацыю тыя, хто перакананы, што ад таго, як і хто будзе размяркоўваць тавары, дэфіцыт (гэта слова стала апошнім часам вельмі папулярным) так і застанецца дэфіцытам. Напэўна, прафсаюзам наўрад ці ёсць неабходнасць выконваць прамыя абавязкі работнікаў гандлю — у іх і сваіх клопатаў хапае. І галоўнае: нас хвалюе тая напружанасць, якая пануе зараз ці не ва ўсіх вялікіх і малых калектывах. Пацвярджаюць гэта і выказванні нашых чытачоў.*

# Ці лёгка дзяліць халадзільнік?

Наш інстытут, дзе працуе 353 чалавекі, атрымаў для размеркавання толькі 1 швейную і 5 пральных машын, 5 халадзільнікаў, 11 тэлевізараў — 9 каляровых і 2 чорна-белых. Пакінуўшы спадзяванні на тое, што гэта толькі на тэрмін аднаго квартала, давялося аддацца ў рукі выпадка — кідаць жэрабя. Склалі спісы з прозвішчамі тых, хто жадае купіць тэлевізар, мае патрэбу ў халадзільніку. За іх кожны з праforгаў чатырнаццаці падраздзяленняў выцягваў паперку — «шчаслівую» або не. Некаторыя супрацоўнікі пажадалі кінуць жэрабя асабіста. Але ж змяніць гэтым вынікі яны не маглі...

## На ўсялякі выпадак

Я таксама была ў спісе сваёй лабараторыі — на халадзільнік і пральную машыну. Ні ў адным выпадку мне не пашанцавала.

Мне здаецца, мы знайшлі найлепшы варыянт з усіх магчымых у дадзеным становішчы: не ўлічвалі стаж і працоўныя заслугі пры складанні спісаў, не стваралі камісій для высвятлення таго, хто што мае дома з бытавой тэхнікі.

Да вынікаў усе аднесліся даволі спакойна. Але гэта яшчэ не сведчанне нармальнага становішча. Жадаючых засталося шмат. Усе яны незадаволеныя такой сістэмай набыцця неабходных у быце рэчаў.

Да таго ж з'явіўся нездаровы ажыятаж: нават тыя, каму ў дадзены момант нічога з бытавой тэхнікі не патрэбна, спяшаюцца апынуцца ў спісах жадаючых, каб набыць хоць што-небудзь — на ўсялякі выпадак...

В. БАГДАНАВА,
старшыня прафбюро НДІ фізіка-хімічных праблем.



## Раскоша ці неабходнасць?

Два дні ў памяшканні універсітэцкай бібліятэкі панавала напружаная, нервовая атмасфера. Віною раздору міжволі з'явіліся звычайныя хатнія рэчы: адна швейная і дзве пральныя машыны, адзін халадзільнік і чатыры тэлевізары. Перад прафбюро стаяла складаная задача раздзяліць наяўнае на ... сто чалавек. Ні тэлевізар, ні халадзільнік, ні пральную ці швейную машыны па кавалку не раздасі.

**Таццяна Іванаўна МІЦЮХІНА — праforг:**

— Давялося прыбегчы да больш простага спосабу. Разыграць рэчы ў «латарэю». Праўда, што тут пачалося. Успомніць сорамна. Не, не за сябе і за сяброўак па рабоце, за... беднасць такую крыўдна. Прыносяць людзі заявы са спадзяваннем у вачах, а то і са слязьмі. Мне ж у адказ застаецца абнадзейваць іх на шчаслівы выпадак, на лёгкую руку. Іншым жа і гэтага права не было. Каб неяк стымуляваць работу, вырашылі, што ўдзельнічаць у «розыгрышы» будуць работнікі са стажам пяць і болей гадоў.

Улічвалася таксама і грамадская дзейнасць. Відавочна, колькасць канкурэнтаў зменшылася, але атмасфера толькі абвастрылася. «Маладая апазіцыя», вядома, пакрыўдзілася на такую несправядлівасць. Тут ужо не да працы было, у кожнай у думках і на вуснах адно: «Пашанцуе ці не?».

**Святлана Георгіеўна БАДЗЯЛІК — старшы бібліёграф:**

— Мне пашанцавала. Я «выцягнула» тэлевізар. Але колькі нервовых клетак гэта ўсё каштавала, нават ночы перад «гульнёй» не спала. Гэта ж адзін шанц на год. А без тэлевізара ці, скажам, халадзільніка, пральнай машыны якое сёння жыццё? Дарэчы, невядома яшчэ, калі атрымаю свой «нервовы выйгрыш». Паштоўкі ў прафком адправіла, а колькі чакаць давядзецца? Лепш і зручней было б набыць гэтыя рэчы ў магазіне, стаўшы там на чаргу. Хоць і марудна, затое надзейна і не патрэбна маліцца на яго вялікасць Выпадак. Добра, што пашанцавала, а калі б...

**Елізавета Сямёнаўна БУНКЕВІЧ — галоўны бібліёграф:**

— Мне засталося толькі чакаць наступнага «тыражу»... А можа ў хуткім часе наша прамысловасць запоўніць пустуючыя прылаўкі магазінаў? Я добра разумею, што патрабаваць і скардзіцца прасцей за ўсё, але ж гэтыя рэчы не раскоша, а звычайная неабходнасць. Дзіўна, чаму іх выдзелілі такую мізэрную колькасць? Добра, што заробак невялікі і праблема траты грошай пакуль не хвалюе.

## Па-за колам Фартуны

Дзень размеркавання для нас з мужам быў днём надзей. Нарэшце, спадзяваліся мы, скончыцца амаль чатырохгадовая пагоня за швейнай і пральнай машынамі, а разам з гэтым і шэраг розных дадатковых клопатаў. Але ўдача абмінула нас у чарговы раз. Зноў усплылі на памяць бясконцыя бадзянні па магазінах у пошуках жыццёва неабходных рэчаў, перабінтаваныя пальцы пасля штодзённага мыцця бялізны ўручную і чарадзейства з маленькай іголачкай над кашулькай для сына. Адышлі ў нябыт і ружовыя мары аб вызваленым часе, наведванні тэатра ці кіно. Засталася адна надзея на наступны тур розыгрышу бытавых рэчаў, на шчаслівы выпадак набыць штосьці ў камісійным магазіне, на прамысловасць урэшце рэшт. Іншых льгот маладым сем'ям у нас пакуль няма. Праўда, спрачацца з ветэранамі, інвалідамі вайны, персанальнымі пенсіянерамі за прыярытэтнае права ў атрыманні пральнай машыны язык не паварочваецца. Яна патрэбна ўсім. Вось толькі як вызначыць крытэрый найвастрэйшай неабходнасці, каб тыя, хто церпіць нястачу (інакш і не назавеш), не апынуліся па-за колам Фартуны?

А. СЯРГЕЕВА.

*Такога ажыятажу вакол звычайных хатніх рэчаў за 25 год работы ва універсітэце я яшчэ не бачыў. Зрэшты, яго ніколі і не было, хоць дэфіцыт, здаецца, адчувалі заўсёды. Праўда, раней кожны заставаўся сам-насам са сваёй праблемай. Зараз жа вырашылі падзяліць справядліва. А па-сутнасці ні адзін спосаб (няхай сабе латарэя альбо ўзнагарода па заслугах) няправільны. Першы — разлічаны на «шчаслівчыкаў», другі — на... Хто яго ведае на каго? Як вызначыць ступень «заслужанасці», каму аддаць перавагу? Адзіна правільнае выйсце — ліквідаваць размеркаванне, аднак гэта магчыма толькі пры поўным забеспячэнні таварамі. Што ж, застаецца чакаць часу, калі адзіным «размеркаваннем» стане, як і належыць, мой зароблены рубель. А рабіць са звычайных рэчаў нешта накшталт ордэна пасля сямідзесяці год Савецкай улады проста сорамна. Нават калі табе дастаўся бязвыйгрышны нумарок. Лепш ужо пачакаць.*

Э. ПАДОЛЬНЫ.

**...І КАМЕНТАРЫІ**

## ДА ДВУХ АСНОЎНЫХ ПЫТАННЯЎ

**ДА ПЫТАННЯ ПЕРШАГА:**

***Хуткасць свету для чутак — жартачкі: «Неверагодна, каб па справядліваму размеркаванню на ўвесь журфак выдзелілі толькі адзін халадзільнік!», «А ў нас маладой (колькі тут працавала!) дасталіся і пральная машына і халадзільнік». На пэўным этапе са звычайных і наогул бяскрыўдных чутак вырастаюць злосныя плёткі, вывады наконт пакрыўджаных і вінаватых. Для першых прайграем такую сітуацыю: мне патрэбна была швейная машына...***

Э. А. Анемпадзістава, старшыня жыллёва-бытавой камісіі прафкома універсітэта:

— У вас быў шанц: не кожная жанчына адважыцца сумяшчаць работу, хатнія клопаты і заняткі рукадзеллем, таму ў спісах жадаючых вы наўрад ці апынуліся б на тысячным месцы. Праўда, і швейных машын, зыходзячы з выпіскі з разнарадкі выканкома Маскоўскага райсавета народных дэпутатаў, выдзелена менш, чым астатніх тавараў доўгатэрміновага карыстання (параўнайце: 82 халадзільнікі, 107 пральных машын). Лічбы ніхто не ўтойваў. У той жа дзень копія разнарадкі паявілася на стэндзе.

На нейкі час мы перакваліфікаваліся ў матэматыкаў, падлічваючы каэфіцыент забяспечанасці (у лічніку — колькасць выдзеленых універсітэту халадзільнікаў, тэлевізараў і г. д., у назоўніку — колькасць працуючых). Без каэфіцыента не абысціся. А калі памножыць яго на колькасць супрацоўнікаў падраздзялення, даведаемся, чаму адны атрымалі два, а другія пяць тэлевізараў.

Ёсць тавары, што карыстаюцца вялікім попытам: халадзільнік «Мінск-15», пральныя машыны «Малютка» і «Фея». Ніякая камісія не змагла б тут раздаць кожнай сястры па завушніцы. Таму ўсе праforгі цягнулі жэрабя. Ніводную рэч прафком не пакінуў пра запас.

А ў падраздзяленнях пісаліся спісы жадаючых. Дарэчы, у апошні момант заявы, як гаворыцца, проста пасыпаліся. Быццам усім спатрэбілася ўсё. Людзей можна зразумець: хто яго ведае, дзе пашанцуе. Хто гарантуе, што ўсе набытыя раней бытавыя рэчы не выйдуць са строю на наступным тыдні? А потым шукай ветру ў полі.

Нарэшце, тур жараб'ёўкі ў падраздзяленнях прайшоў. Калі б вы ў ім удзельнічалі з поспехам, вам засталося б толькі запоўніць дзве паштоўкі з маркамі за 10 капеек, а нам — унесці ваша прозвішча ў агульны спіс для прадастаўлення ў райвыканком. Тэрмін паступлення тавараў — год. Шчаслівчыкі чакаюць паведамленняў. У астатніх шанцаў набыць што-небудзь з тавараў доўгачасовага карыстання ў гэтым годзе не засталося.

**ДА ПЫТАННЯ ДРУГОГА:**

***Магчыма, 107 чалавек, ашчасліўленых хуткім набыццём малагабарытных машын, 82 будучыя гаспадары халадзільнікаў, 35 — швейных машын, якія праз год не будуць толькі марай, для універсітэта не так ужо і мала. Праўда, сістэма ўсё ж здаецца недасканалай. Вы прапанавалі разыгрываць звычайныя, неабходныя ў быце рэчы.***

В. М. АНІШЧЫК, старшыня прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў:

— Сапраўды, атрымаўся цырк. Большасць людзей з тых, хто не ведае, колькі часу давялося нам патраціць для выпрацоўкі гэтай сістэмы, незадаволены. На наш погляд, абраны метад найбольш дэмакратычны і справядлівы. Была прапанова праводзіць размеркаванне па спісах з прозвішчамі тых, хто мае патрэбу ў тых ці іншых рэчах. Слушная? Але заяў намнога больш. Справядлівая? А што, калі, скажам, невялікі штат прафілакторыя раней за ўсіх аформіць заяўку? Яму лягчэй гэта зрабіць, чым НДІ ПФП, дзе працуе больш за 700 чалавек.

Намі незадаволены, але і ў нас ёсць прэтэнзіі. Хіба прафсаюзы створаны дзеля таго, каб выконваць функцыі гандлю? Мы павінны ствараць умовы для нармальнай дзейнасці: клапаціцца аб піянерскіх лагерах, дамах адпачынку для супрацоўнікаў і г.д. Нам жа даводзіцца выконваць ролю белых нітак, якімі спрабуюць латаць прарэхі дэфіцыту, сутыкаць ілбамі людзей у калектывах. Гэта вынік страчаных намі энергіі і часу? Нам такі наўрад ці патрэбны.

## ВАЗЬМІЦЕ НА ЗАМЕТКУ

# «Спектр» збірае творцаў

*ІНЖЫНЕР-ТВОРЦА. Ад гэтага словазлучэння даўно ўжо адвыклі нават самі прадстаўнікі гэтай прафесіі, якім часта даводзіцца замест творчасці займацца перакладваннем паперак. Але час адраджае прэстыж інжынерных прафесій. Сведчанне таму — работа цэнтра навукова-тэхнічнай творчасці моладзі «Спектр». Мэта яго — дапамагчы думаючым спецыялістам рэалізаваць свой творчы патэнцыял.*

Сумеснае рашэнне Савецкага райвыканкома і райкома ЛКСМБ аб стварэнні цэнтра было прынята год назад. Неабходнасць яго ў многім прадыктавала само жыццё. І справа не толькі ў зніжэнні творчай актыўнасці інжынераў. Адсутнасць сапраўднай дэмакратыі, кансерватызм у метадах кіравання, дэфіцыт праўдзівай інфармацыі аб стане навукова-тэхнічнага прагрэсу ў краіне ў параўнанні з сусветным узроўнем — усё гэта прывяло да таго, што дзяржава, якая мае велізарныя рэсурсы, навукова-тэхнічны патэнцыял, атрымлівае аддачу ад навукова-тэхнічнай творчасці ў дзесяць разоў меншую, чым развітыя капіталістычныя краіны. Для параўнання: у СССР гэты паказчык складае 38 млрд. руб. у год, а ў ЗША — 400 млрд. руб.

Чым жа мы займаемся?

У асноўным выконваем пасрэдніцкую ролю: заключаем дагаворы з дзяржаўнымі арганізацыямі на выкананне розных навукова-даследчых работ. Творчы калектыў цэнтра — спецыялісты, якія валодаюць неабходнай кваліфікацыяй і працуюць тут у вольны ад работы ці вучобы час. Яны зацікаўлены выканаць заказ як мага хутчэй і якасней: ад гэтага залежыць аплата іх працы. А цэнтр дапамагае ім вырашаць праблемы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, арэнды абсталявання і машыннага часу. Заказчыкам зручна тое, што ў нас няма шматступенчатых узгадненняў.

За год цэнтр заключыў дагаворы з прадпрыемствамі і арганізацыямі розных рэгіёнаў рэспублікі і краіны на 7 млн. рублёў, выканаў і здаў заказчыку работ на суму каля 3 млн. рублёў. Больш 3,5 тысяч спецыялістаў працуюць над выкананнем заказаў. Гэта дае не толькі дадатковы заробак. Перш за ўсё, кожны ўносіць рэальны ўклад у рашэнне тых ці іншых праблем у галінах радыётэхнікі, электронікі, экалогіі, аховы здароўя, машынабудавання і інш.

Аднак не толькі дагаворнай работай займаецца цэнтр НТТМ «Спектр». Пад свой кантроль ён узяў і ўкараненне найбольш арыгінальных распрацовак таленавітых вынаходнікаў і рацыяналізатараў, інфармаванне аб стане творчай думкі ў той ці іншай галіне навукі і тэхнікі, арганізацыю выставак і кірмашоў ужо выкананых і рэкамендуемых да ўкаранення работ.

Больш падрабязную інфармацыю аб формах і сферах дзейнасці цэнтра «Спектр» вы атрымаеце, калі патэлефануеце ў вытворчы аддзел (тэл. 31-92-63) ці аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі (тэл. 31-97-61) з 8.30 да 20.00 гадзін.

**Г. ЗАХАРЧАНКА,**
загадчык аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі НТТМ «Спектр».

## ТРЫВОЖНЫ ЛІСТ

Боль і пакута ў кароткіх і пранізлівых, як маланкі, тэлетайпных паведамленнях: «19.12.1988 г. у 11 гадзін у в. Чорная Вірня Жлобінскага раёна ўзнік пажар ад дзіцячага свавольства з агнём. У полымі загінулі дзеці Калбанцавых: чатырохгадовая Алеся, двухгадовы Коля і васьмімесячная Волечка. Бацькі знаходзіліся на рабоце...» «19.12.88 г. у 13 гадзін у в. Арэхаўка Клічаўскага раёна ў полымі загінулі малыя ўнукі М. С. Арловай: Павел, Тоня, Юля. Дзеці знаходзіліся ў доме без нагляду, хоць у вёсцы ёсць два дзіцячыя садзікі». «21.12.88 г. у 15 гадзін у в. Нямкова Горацкага раёна ў выніку загарання дывана ад свавольства з запалкамі пакінутых без дагляду малых загінуў двухгадовы Дзяніс Брызгіновіч».

# БЕРАЖЫЦЕ ДЗЯЦЕЙ!

У бягучым годзе ў рэспубліцы на пажарах загінула 70 дашкольнікаў. Галоўная прычына трагедый — дзеці знаходзіліся адны, без старэйшых.

Міністэрства ўнутраных спраў рэспублікі вельмі занепакоена такім становішчам і звяртаецца да бацькоў, бабуль, дзядуль: «Не пакідайце дзяцей адных, без нагляду нават на некалькі хвілін. Не пускайце іх да печак, якія гараць, электрапрылад, хавайце запалкі ад дзяцей, а таксама з ранняга дзяцінства вучыце іх правілам пажарнай бяспекі».

А да работнікаў пажарнай аховы, участковых інспектараў міліцыі, супрацоўнікаў ІДН, добраахвотных памочнікаў пажарнага таварыства адзінае патрабаванне: арганізаваць шырокую тлумачальную работу сярод насельніцтва па папярэджанню пажараў. Неабходна дадаткова праводзіць супрацьпажарныя інструктажы мнагадзетных сем'яў, а таксама ўзяць на ўлік усе сем'і, дзе бацькі працуюць, а дзяцей няма з кім пакінуць, і праз адпаведных кіраўнікоў дабівацца арганізацыі нагляду за імі.

Захаваць жыццё дзяцей — наш святы абавязак. І ніхто ў гэтай справе не павінен быць у баку.

**В. БЫКАЎ,**
намеснік Міністра ўнутраных спраў Беларускай ССР.

## АДПАЧЫВАЙЦЕ НА ЗДАРОЎЕ!

# Пра «Дружбу», «насценку» і... дробязі

КАНЧАТКОВЫ пункт маёй камандзіроўкі — дом адпачынку «Нарач». А калі больш дакладна — інтэрнацыянальны студэнцкі лагер «Дружба».

Заходзіш у вестыбюль корпуса № 3, дзе размешчаны лагер, і адразу звяртаеш увагу на ўтульнасць і сапраўды дамашнюю абстаноўку (нават стол для гульні ў тэніс не псуе гэтага ўражання): трыльяж, часопісны столік, на якім заўсёды ляжаць свежыя перыядычныя выданні, зручныя мяккія крэслы. Тут абавязкова каго-небудзь сустрэнеш. Нехта любіць пагуляць у тэніс, хтосьці бавіць час за шахматнай дошкай, а гэтым дваім больш да спадобы ціхая, задушэўная размова. Тут жа, у вестыбюлі, звычайна праводзяцца спартыўныя спаборніцтвы. І тады шум стаіць небывалы: балельшчыкі часам надзвычай бурна выражаюць свае эмоцыі.

Выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту Я. М. Залуцкі такому гоману не здзіўляецца. Больш таго, ён перакананы, што інакш і быць не можа, бо станоўчыя эмоцыі толькі на карысць чалавеку.

— А яшчэ прыемна назіраць, як рабяты радуюцца поспеху сваіх сяброў, вучацца разам перажываць няўдачы, умеюць цаніць дружбу і падтрымку, а таксама не крыўдзяцца на крытыку, разумеюць жарты.

...Камісар лагера Л. М. Валчок прапанавала кожнаму атраду выпусціць насценную газету. У ёй неабходна было адлюстраваць уражанні аб першых днях, праведзеных у доме адпачынку. Пісалі, хто што заўважыў: і пра меню, у якім дрэнна ўлічваюцца асаблівасці нацыянальнай кухні, і пра пункты пракату лыж, якія з-за адсутнасці снегу можна было наогул ліквідаваць, і, безумоўна, пра дружбу ў «Дружбе». Першай справілася з заданнем рэдкалегія Мінскага электратэхнікума сувязі. Сюжэты малюнкаў — разнастайныя. Прычым, выкананы яны на нядрэнным мастацкім ўзроўні. Вось адзін з накідаў. Ноч. За вокнамі — месяц і зоркі, а ў пакоі... гуляюць у настольны тэніс. Подпіс растлумачваў усё. Аказваецца, напярэдадні спаборніцтваў па настольнаму тэнісу навучэнец тэхнікума Дэлага (Афганістан) у тры гадзіны ночы пачаў падрыхтоўку да іх.

Праз некаторы час газету (як і «насценкі» іншых атрадаў) вывесілі на стэндзе. А яшчэ хвілін праз дваццаць Ларыса Мікалаеўна (здзіўляюся яе настойлівасці і цярпенню) ужо займалася рэстаўрацыяй. Магчыма, з пункту гледжання педагогікі ў гэтым быў нейкі выхаваўчы момант, толькі я старалася ўпэўніць камісара ў тым, што чалавек, пазбаўлены пачуцця гумару, няшчасны, і што работа гэта — дарэмная трата часу. Газета ўсё ж «нарадзілася» другі раз, а я адзначыла для сябе: геройства, якое адчувалася ў паводзінах навучэнца пасля таго, як ён сарваў «насценку», нібы рукой зняло. Ён зразумеў сваё паражэнне.

Начальнік лагера, дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў БДУ Ізяслаў Міхайлавіч Марозаў лічыць, што ў выхаванні чалавека сапраўды не бывае дробязей. І гэта ён штораз падкрэсліваў на ранішніх планёрках, дзе падводзілі вынікі зробленага за мінулы дзень, намячалі мерапрыемствы на сённяшні.

— У час адпачынку нашы падапечныя не павінны забывацца пра культуру, пра тое, што існуюць правілы ўнутранага распарадку і іх патрэбна выконваць. І ўсе мы, педагогі, сваім знешнім выглядам, паводзінамі, учынкамі павінны паказваць прыклад. І абавязкова быць прынцыповымі. Інакш нам перастануць верыць, мы страцім аўтарытэт, аднавіць які амаль немагчыма.

Быць выхавацелям — нялёгка. Хочаш ці не, а ўдзельнічаць у віктарыне патрэбна. На экскурсіі без педагога таксама не абысціся. А вечарам у танцавальнай зале дыскатэка, і хоць стаміўся за дзень і хочацца адпачыць, ты зноў разам са сваімі выхаванцамі. Патрэбна газету намаляваць — абавязкова за парадай да выкладчыкаў прыйдуць. Захацелі рабяты ў басейн, і нягледзячы на адлегласць (больш за 4 кіламетры), іх вадзілі туды некалькі разоў. Так што тут педагог, як кажуць, і шавец, і на дудзе ігрэц.

Праўда, у доме адпачынку ёсць фізрук, намеснік дырэктара па культурна-масавай рабоце (для арганізацыі такой работы ёсць клубы, бібліятэка з чытальнымі заламі, пакоі для ціхіх гульняў, летнія эстрады, валейбольныя і гарадошныя пляцоўкі, лодачныя станцыі, паркавыя лаўкі і альтанкі), толькі ў іх ролі ў асноўным выступаюць выкладчыкі. Ды і студэнты з большай ахвотай ідуць на тыя мерапрыемствы, якія праводзяцца непасрэдна ў лагеры. Запомнілася, напрыклад, віктарына «Што ты ведаеш пра Беларусь?». Аказалася, не так ужо і мала: называюць гарады, рэкі, азёры, помнікі архітэктуры і культуры, у курсе літаратурных спраў. А тыя, хто не пажадаў удзельнічаць у віктарыне, таксама не сумавалі. Яны мелі магчымасць паглядзець фільм, паслухаць лекцыю, паехаць на экскурсію, проста пагуляць па лесе, пазнаёміцца са славутасцямі Нарачанскага краю, наведаць біялагічную станцыю БДУ імя У. І. Леніна, турбазу «Возера Нарач». Хто паспеў запісацца напярэдадні, таму прапануюць паездку ў сталіцу Літоўскай ССР Вільнюс, у Каўнас, старажытную сталіцу Літвы Тракай, наведаць мемарыяльны комплекс «Хатынь».

У госці да адпачываючых часта прыязджаюць артысты, пісьменнікі, мастакі...

Перад ад'ездам неяк зусім выпадкова завязалася размова з рабятамі (тут адпачываюць навучэнцы тэхнікумаў, БДУ, педагагічнага, медыцынскага, політэхнічнага інстытутаў, наргаса, інстытута культуры і іншых вышэйшых навучальных устаноў Мінска). Мне цікава было даведацца, ці спадабалася ім у доме адпачынку.

— Так, вельмі,— за ўсіх адказаў Рахула Вафадуст з Афганістана.— Мы яшчэ раз пераканаліся ў выключнай шчырасці і добразычлівасці беларускага народа. Ведаеце, раней я ўвесь час думаў, чаму Беларусь называюць сінявокай. Нават прыглядаўся да вачэй людзей. Маўляў, напэўна, таму, што ва ўсіх яны сінія ці блакітныя. А зараз дакладна ведаю: сінія вочы — гэта шматлікія азёры. І самае цудоўнае з іх — возера Нарач.

**З. АЛЯШКЕВІЧ,**
наш кар.

## ПОЗІРК З-ПАД БРЫВА

Я доўга здзіўлялася, чаму яго так засмучаў прыход зімы. А ён быў перакананы: нягледзячы на стопрацэнтнае наведванне лекцый студэнты (і семінары гэта пацвярджалі) засвойвалі ў гэтую пару года толькі дзве трэціх выкладзенага матэрыялу. Гэта яго непакоіла. Як чалавек сумленны, выкладчык пачынаў сумнявацца ва ўласным прафесіяналізме. Пакуль, пачуўшы неяк шапаценне пакетаў у пачатку і паназіраўшы за вазнёй з прыстасаваннем на партах футравых шапак побач з канспектамі, не паставіў пытанне так:

— Чаму студэнт павінен па супяшчальніцтву працаваць вартаўніком сваёй шапкі?

Сапраўды, чаму?

Намякаць звычайна ўсмешлівай бабульцы на журфаку аб абавязках сачыць за парадкам у гардэробе пасля яе жорстка кінутага «Крадуць!» было не да месца. Камендант корпуса Т. Я. Слемянёва маім пытаннем таксама незадаволена:




— Нідзе ў вышэйшых навучальных установах у студэнтаў шапкі не прымаюць.

Магчыма, таму мне груба адмовілі і ў гардэробе хімічнага факультэта? Спасылаліся, праўда, на адсутнасць неабходных прыстасаванняў. Шапкі падаюць, пэцкаюцца, пераблытваюцца. На маю долю засталося толькі зайздросціць выкладчыкам хімічнага факультэта, на чые шапкі штыроў хапае.

— З новага навучальнага года, калі з'явяцца нумаркі для шапак, ніякіх перашкод і для студэнтаў не будзе,— паспешліва супакоіла камендант хімічнага корпуса Т. М. Аброхава.

Толькі на геафаку (выключаючы галоўны корпус, куды не дайшлі чуткі аб працізаконнасці ў шапачнай справе) гардэробшчыца ціхенька, каб ніхто не чуў, згадзілася ўзяць шапку на асабістае захаванне.

Чаму б не арганізаваць «асабістае захаванне» для ўсіх? Тым больш, што загадаў ці распараджэнняў вышэйшых інстанцый у гардэроб не прыходзіла. Калі, зразумела, не ўлічваць «афіцыйную» версію каменданта вучэбнага корпуса філалагічнага факультэта Я. П. Дрыга аб забароне міліцыі і несумленнае імкненне гардэробшчыц адмовіцца ад адказнасці.

**С. АКТОРЫС,**



THE Gauntlet



Хто? Дзе? Як? Чаму?

# Гісторыя універсітэта Калгары

Універсітэцкі гарадок Калгары сёння ўяўляе вялікі кантраст з тым, як ён пачынаўся ў 1960 годзе: два будынкі сярод прэрый тады і трыццаць вучэбных і навукова-даследчых карпусоў, што размясціліся ў жывапіснай мясцовасці, зараз.

Калгары — пяты па велічыні горад Канады, колькасць жыхароў якога дасягнула 620 тысяч. Універсітэт — яго вядучая адукацыйная і навукова-даследчая ўстанова. Але створаны ён быў як аддзяленне універсітэта Альберты, які знаходзіўся 300 кіламетраў на поўнач ад Калгары, у Эдмантане — сталіцы правінцыі Альберта.

У 1945 годзе ва універсітэце Калгары выкладаліся толькі курсы пачатковага года навучання, а сам універсітэт размяшчаўся на тэрыторыі пераабсталяванай гарадской школы. Да 1946 года ён быў пераведзены туды, дзе зараз размяшчаецца Тэхналагічны інстытут Паўднёвай Альберты (школа вышэйшай прафесійнай адукацыі). Універсітэт Калгары прапаноўваў сваім навучэнцам ужо два першыя курсы з чатырохгадовай адукацыйнай праграмы універсітэта Альберты.

У 1951 годзе былі ўведзены курсы па мастацтву і навуках, а ў 1956 — па фізічнай культуры. У 1957 годзе да іх далучыліся разлічаныя на год курсы па інжынернай справе і камерцыі, якія сталі лепшымі адукацыйнымі праграмамі такога тыпу ў Канадзе.

У 1960 годзе універсітэт, нарэшце, быў пераведзены на пастаяннае месца жыхарства. У той час гэта тэрыторыя размяшчалася на паўночна-заходняй ускраіне Калгары: рэдкая трава, а навокал — пшанічныя палі. Праз дваццаць восем гадоў тэрыторыю універсітэта ўшчыльную акружылі гарадскія раёны, дзе жывуць у асноўным людзі сярэдняга дастатку.

У тым жа 1960 годзе на факультэце Мастацтваў і Навук была прапанавана першая праграма на атрыманне ступені. Універсітэт працягваў расці, паступова ўводзячы поўныя праграмы па фізічнай культуры і інжынернай справе, пакуль не стаў цалкам аўтаномным ад універсітэта Альберты ў 1966 годзе.

За дваццаць два гады, што прайшлі з таго часу, вырас універсітэт Калгары. І рэпутацыя яго заўважна пасталела, склаўшы канкурэнцыю больш старым універсітэтам Канады (хоць і яны адносна маладыя — па еўрапейскіх стандартах). Студэнтам ужо не даводзіцца накіроўвацца ва Усходнюю Канаду, каб атрымаць адукацыю па той спецыяльнасці, якая іх цікавіць: універсітэт Калгары прапануе курсы для атрымання ступені ў галіне сацыяльных і прыкладных навук, гуманітарных дысцыплін, мастацтва, фізічнай культуры, інжынернай справы, педагогікі, ландшафтнай архітэктуры, юрыспрудэнцыі, кіравання, медыцыны, бальнічнай справы і сацыяльнага забеспячэння.



Тыя студэнты, чые адзнакі пасля заканчэння сярэдняй школы (за апошнія тры гады абавязковай школьнай адукацыі) недастаткова высокія, могуць карыстацца паслугамі дапаможных курсаў у трох каледжах правінцыі Альберта. Каледж Монт Раял у Калгары прапануе навучанне, якое адпавядае першым двум курсам большасці праграм універсітэта Калгары, ад нак выкладаюцца яны ў менш інтэнсіўным тэмпе. Каледж Мэдсін Хэт, размешчаны за 300 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад Калгары, паблізу граніцы з ЗША, таксама прапануе падобную праграму. І, нарэшце, ва універсітэце Атабаска ёсць адпаведныя курсы, якія прызнаюцца універсітэтам Калгары.

Многія студэнты універсітэта Калгары прыязджаюць з іншых гарадоў, правінцый Канады і нават з іншых краін, таму універсітэт прапануе ім танныя інтэрнаты ў сваім гарадку. 1150 адзінокіх студэнтаў могуць размясціцца ў сямі будынках. Жыллёвыя ўмовы розныя — ад адзіночных нумароў, якія памерам крыху большыя за звычайныя шафы для адзежы, да чатырохпакаёвых кватэр. Жанатыя студэнты жывуць у 250 двухпавярховых доміках.

Паколькі ва універсітэце Калгары няма курсаў па журналістыцы, гэты прабел папаўняе газета «Гонтлет». Яна выдаецца студэнтамі і для студэнтаў і з'яўляецца тыповай канадскай студэнцкай газетай.

Да жалю Студэнцкага саюза, у выпадку неабходнасці «Гонтлет» можа выступаць і як палітычная арганізацыя. Студэнцкі саюз, які выбіраецца і ўтрымліваецца самімі студэнтамі, адказвае за мерапрыемствы ва універсітэцкім гарадку — пікнікі, сходы, канцэрты, а таксама аказвае ўздзеянне на кіраўнікоў рознага ўзроўню ў тых пытаннях, якія закранаюць студэнцкае жыццё.

# Праблемы разблытвае плебісцыт



Пазіцыя

Студэнты універсітэта Калгары нядаўна сутыкнуліся з дзвюма важнымі праблемамі. Студэнцкі савет звярнуўся да студэнтаў з нагоды павелічэння платы за навучанне ў будучым годзе і па пытанню прапорцый паміж колькасцю аспірантаў, з аднаго боку, і студэнтаў — з другога.

Галасаванне прайшло ў форме плебісцыта, што дае магчымасць даведацца думку студэнтаў, але не навязвае нейкае рашэнне студэнтам ці студэнцкаму савету. Большасць студэнтаў лічаць, што плата павінна заставацца на ранейшым узроўні, але многія перакананы, што неабходна яе павысіць у сувязі з інфляцыяй. Невялікая колькасць студэнтаў выступае за зніжэнне платы.

Пазіцыя студэнтаў па пытанню павелічэння колькасці аспірантаў такая: колькасць аспірантаў можна павялічыць толькі ў тым выпадку, калі павялічыцца колькасць студэнтаў.

Прэзідэнт студэнцкага савета Дон Козак даў каментарый рэзультатам плебісцыта: «Зараз у нас ёсць падставы для выпрацоўкі платформы, якую мы прадставім перад Праўленнем універсітэта Калгары і Міністрам вышэйшай адукацыі».

Наконт павелічэння колькасці аспірантаў ён адзначыў, што «рэзультаты апытання пацвярджаюць імкненне студэнцкага савета падтрымліваць узровень адукацыі на належнай вышыні і трывогу за права студэнтаў своечасова атрымаць адукацыю».

Дэвід ГЕЙЗАРД.

# Шанс на выжыванне

Па сакрэту

Вечарынкі. Выпіўкі. Работа. Клопаты аб эканоміі. Здабыванне грошай і адзнак. Неймаверныя траты. Удзел у студэнцкіх навуковых гуртках. У дадатак да ўсяго — заняткі... Гэтымі словамі можна апісаць студэнцкае жыццё. Вывучыце іх, жывіце ў адпаведнасці з імі, любіце і кляніцеся імі і... праклінайце іх. Калі вы будзеце трымацца маіх парад, то, магчыма, выжывеце.

Жыццё студэнта універсітэта часам дастаткова прыемнае, цікавае; часта прымушае хваляваццa: а, здараецца, проста пекла. Існуе столькі адцягваючых момантаў, што не дзіва надоўга забыць пра вучобу. Можна ўступіць ва універсітэцкі клуб ці прымаць удзел у такіх мерапрыемствах, як студэнцкі савет і студэнцкая газета.

Калі вы будзеце займацца хоць чым-небудзь, страціце шмат часу, але здабудзеце нямала карыснага для будучай кар'еры.

Залікі, навучанне студэнтаў малодшых курсаў, карысныя кантакты і цікавыя вечарынкі — гэта толькі невялікі пералік таго, што могуць прапанаваць студэнцкія клубы.

Але, на жаль, універсітэт — гэта не толькі вяселле і забавы. У параўнанні са школай, веды тут здабываюцца цяжкай працай. Вучоба становіцца цалкам вашым жыццём. Яна можа давесці вас да шаленства, калі вы будзеце аддаваць ёй увесь свой час днём, не кажучы ўжо пра бяссонныя ночы. Менавіта таму, каб захаваць здароўе і бадзёрасць духу, студэнты, ва ўсялякім выпадку, адзін дзень у тыдзень прысвячаюць канцэртам, ходзяць у бар і кабарэ (канцэрты, на якіх моцныя напіткі прадаюцца на тэрыторыі студэнцкага гарадка), наведваюць усе месцы забаў, якія толькі могуць прыдумаць. Але ўсе ведаюць, што нястрыманыя забавы не праходзяць бясследна, асабліва ў час сесіі.

Універсітэцкае жыццё — гэта не толькі вучоба і розныя гурткі і секцыі, гэта магчымасць адчуць сябе незалежным. Многія студэнты адчуваюць гэта ўпершыню. Большасць з іх жывуць вельмі эканомна і пастаянна лічаць грошы, якія засталіся. Гэта вельмі цяжкая і часта проста немагчымая задача, калі ўлічыць высокі кошт навучання і кніг, не кажучы ўжо аб тым, як часта нам не хапае «дробязей» і не толькі іх.

Прадукты і адзенне — гэта рэчы, у якіх студэнт пастаянна адчувае патрэбу. Калі вам пашанцавала і вашы бацькі жывуць не далёка ад студэнцкага гарадка, вы можаце прыехаць дамоў і наесціся на тыдзень смачнай ежы (што, безумоўна, нельга параўнаць з макаронамі і сырам на вячэру кожны дзень).

Універсітэты заўсёды былі месцамі збору моднай моладзі, таму заўсёды хочацца быць модна апранутымі. Гэта прыводзіць да дадатковых паездак да бацькоў і замацавання вопыту выпрошвання грошай на звышмодныя рэчы.

Карацей, універсітэцкае жыццё — гэта пастаянныя спешкі, эмоцыі, хваляванні, але гэта цудоўнае жыццё (мне здаецца, што іменна з-за гэтага студэнты ніяк не могуць і не хо-



чуць развітвацца з універсітэтам і вучацца па дзевяць-дзесяць гадоў).

ТЭМІ ХІРШ,
універсітэт Калгары,
для «Беларускага універсітэта».

# «Лічу, спадзяюся, зрабіце так...»

Скрынка для прапаноў

**У СПЕЦЫЯЛЬНУЮ СКРЫНЮ ДЛЯ ПРАПАНОЎ СВАЮ ЗАПІСКУ МОЖА АПУСЦІЦЬ КОЖНЫ СТУДЭНТ УНІВЕРСІТЭТА КАЛГАРЫ. І КОЖНАМУ ГАРАНТУЕЦЦА АДКАЗ. ЧАСАМ — ПРАЗ УНІВЕРСІТЭЦКУЮ ГАЗЕТУ. МЫ ЗНАЁМІМ ВАС З НЕКАТОРЫМІ З ІХ.**

**Пытанне:** Вельмі спадзяюся, што я ўбачыла толькі дрэнны сон. Хто маляваў Нью Мак Хол такімі дрэннымі фарбамі? Дзе іх узялі? Думаю, гэта грунтоўка. Патрэбна сказаць, што выгляд у яго даволі жаласлівы.

Адказ: Выбар каляровай гамы для новага студэнцкага цэнтра Мак Хол матываваны тым, што ў цэнтры, выкарыстоўваючы сучасныя метады афармлення, стараліся стварыць зусім не вучэбную атмасферу. Так што гэта не грунтоўка, а канчатковы варыянт.

**Пытанне:** Зараз часта можна пачуць незадаволенасць тым, што універсітэту скарачаюць фонды. Шмат скаргаў паступае таксама наконт новай стаянкі для машын. Хацелася б ведаць, чаму ў начны час (да 11.30 гадзін) стаянку абслугоўваюць два служачыя? Усе занепакоены, што выдзяляецца менш сродкаў, і тым не менш універсітэт наймае двух служачых, у той час, калі хапіла б аднаго. Глупства. Я лічу, што ў начны час стаянку павінен абслугоўваць толькі адзін чалавек, таму што ёю мала хто карыстаецца. Таксама лічу, што тры служачыя днём — залішне.

Адказ: Мы перадалі вашу прапанову адміністрацыі стаянак аўтамашын. Нам адказалі, што вечарам патрэбны два служачыя, таму што на тэрыторыі студэнцкага гарадка часта праходзяць розныя мерапрыемствы, тэатральныя або спартыўныя. Што датычыць дзённага часу, то тры чалавекі проста неабходны, таму што ў гадзіны «пік» два чалавекі з работай не справяцца.



**Пытанне:** Чаму палова дзвярэй у Мак Холе закрытыя? Я спрабаваў неяк прайсці праз паўночны і ўсходні ўваходы, але мне гэта не ўдалося. Быў адкрыты толькі паўднёвы ўваход. Чаму б не адчыніць усе дзверы?

Адказ: Дазорцы будынка павінны адчыняць дзверы з раніцы. Дзіўна, што яны былі зачынены. Калі такая сітуацыя паўторыцца, тэлефануйце ўпраўляючаму будынкам.

**Пытанне:** Зрабіце так, каб у пакоі адпачынку інжынернага факультэта не курылі. Дарэчы, курэнне там забаронена, але ніхто гэта патрабаванне не выконвае. Там немагчыма ні адпачываць, ні працаваць: дым ідзе клубамі.

Адказ: На жаль, мы не можам забараніць людзям курыць, нават калі гэта месца, дзе курэнне не дазволена. Як толькі вывешваецца шыльдачка «Курэнне забаронена», яе зараз жа зрываюць. Студэнты самі павінны кантраляваць тое, як праводзіцца барацьба з курэннем. Магчыма, вам лепш знайсці іншае месца для адпачынку і работы? Калі вы не задаволены адказам, то, як нам паведамілі, можаце звяртацца ў дэканат інжынернага факультэта са сваімі прапановамі па барацьбе з курэннем і іншымі пытаннямі.

**Пытанне:** Лічу, што цэны ў студэнцкім кафэ для студэнтаў вельмі высокія. Яны такія, як і ў цэнтральных рэстаранах. Але там жа вольныя прадпрымальнікі. Каму ідуць даходы тут?

Адказ: Даходы вяртаюцца ва універсітэцкі бюджэт. Мы лічым, што цэны павінны быць зніжаны. А розніца павінна ўваходзіць у плату за навучанне. Мы вынеслі адпаведныя прапановы на разгледжанне адміністрацыі студэнцкіх кафэ і зараз чакаем адказу. А пакуль вам давядзецца мірыцца з цэнамі ці прыносіць ежу з сабой.

**Пытанне:** У мінулым годзе правялі рэферэндум з тым, каб забараніць курэнне ў цэнтры Мак Хола. Я размаўляў з многімі студэнтамі, якія кураць, і яны сказалі, што калі б ведалі, што ўсё адбудзецца так хутка, то галасавалі б супраць забароны. Думаю, патрэбна правесці яшчэ адзін рэферэндум.

Адказ: Вы жартуеце? Гэта ж тое самае, калі б вы сказалі: «Я прагаласаваў бы за свайго сябра, калі б ведаў, што ён прайграе». Чаму вы і вашы сябры, калі вы курыце, не прагаласавалі супраць забароны ў мінулым годзе? Рашэнне было прынята дэмакратычным шляхам і новага рэферэндума ніхто праводзіць не плануе.

**Пытанне:** Хацелася б ведаць, ці носіць ваш прэзідэнт бацінкі на платформе?

Адказ: Не, але калі вы яму купіце пару, ён, магчыма, падумае.

Для «Беларускага універсітэта» рыхтавалі: Дарадчы савет па кантактах, а таксама яго віцэ-прэзідэнт КЕВІН ТУРМ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
16 лютага
Зак. 1611.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.